Сёння, 9 снежня стартуе галасаванне за лепшую паштовую марку 2024 года

З 9 па 23 снежня ў кожнага з вас ёсць унікальная магчымасць стаць часткай займальнай падзеі — галасавання за «лепшую паштовую марку Рэспублікі Беларусь 2024 года»! Гэты конкурс праходзіць кожны год, і мы запрашаем усіх жадаючых прыняць у ім удзел.

З 9 снежня аддаць свой голас за лепшую марку можна будзе на BELPOST.BY у спецыяльным раздзеле!

Для ўдзелу неабходна выбраць адну ўпадабаную паштовую марку або паштовы блок. Лепшай будзе прызнана тая паштовая марка, якая атрымае большасць галасоў. Калі некалькі марак атрымае роўнае колькасць галасоў, то ўсе яны будуць прызнаныя лепшымі паштовымі маркамі.

Вынікі конкурсу будуць размешчаны 26 снежня на сайце РУП «Белпошта». Далучайцеся да галасавання і дапамажыце выбраць самую прыгожую паштовую марку краіны!

Малюнак



Source URL:
https://mpt.gov.by/syonnya-9-snezhnya-startue-galasavanne-za-lepshuyu-pashtovuyu-marku-2024-goda